

ПРАВЕРКА НА ТРЫВАЛАСЦЬ



ВАША ПЕЧАНЬ У БЯСПЕЦЫ? 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

31 ліпеня 2024 г.
СЕРАДА
№ 147 (30281)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

## КОРАТКА

• У аўторак Прэзідэнт правёў тэлефонную размову са старшынёй праўлення ПАТ «НК «Раснафта» Ігарам Сечыным. Таксама беларускі лідар пагаварыў па тэлефоне са старшынёй Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Расійскай Федэрацыі Генадзем Зюганавым.

• 5 жніўня 2024 года Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ігар Сергяенка правядзе асабісты прыём грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб у Палаце прадстаўнікоў. Прыём праводзіцца па папярэднім запісе па тэл. (017) 222-69-25 з 30 ліпеня па 2 жніўня 2024 года з 08.00 да 18.00.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей КАВАЛЬЧУК, міністр спорту і турызму:**

*«Тое, што нашы спартсмены вымушаны выступаць на Алімпіядзе ў нейтральным статусе і што з 35 беларускіх спартсменаў, якія выйгралі ліцэнзіі, да гульняў дапушчаны толькі 17 чалавек, не робіць гонару чыноўнікам ад спорту. Але ніякім чынам не прымяншае заслуг нашых спартсменаў, якія паехалі на Алімпійскія гульні. Няважна, у якім статусе і пад якім сцягам, але яны — прадстаўнікі Рэспублікі Беларусь. Мы ўсе за іх перажываем і хваляемся. Выхад у фінал Алімпійскіх гульняў у плаванні і тое, што нашы спартсмены прадстаўляюць Беларусь на гэтых спаборніцтвах, ужо сведчыць аб тым, што сёння мы ў правільным кірунку рухаемся.»*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Галоўнае — айчынная навука павінна рухаць эканоміку краіны»

## Прыйшоў час спытаць навукоўцаў за канкрэтны вынік

**«Краіна знаходзіцца на такім этапе развіцця, калі без навукі немагчыма зрабіць ніякага руху наперад. Таму навука і яшчэ раз навука», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, адкрываючы нараду з рабочай групай па аналізе дзейнасці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. У склад гэтай групы ўвайшлі прадстаўнікі Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях, прадстаўнікі міністэрстваў і ведамстваў. У Палацы Незалежнасці члены рабочай групы разам з членамі ўрада, прадстаўнікамі Адміністрацыі Прэзідэнта і навукоўцамі сабраліся, каб актуалізаваць праблемы, абмяняцца меркаваннямі па іх вырашэнні і выказаць свае погляды на сітуацыю ў цэлым.**



Фота БелТА.

Кіраўнік дзяржавы растлумачыў, чым была выклікана неабходнасць стварэння рабочай групы. «Сказаць, што мы не займаемся навуковымі даследаваннямі, як фундаментальнага характару, так і прыкладнога, не займаемся навукай у адукацыйных установах, было б няправільна. Займаемся, — сказаў ён. — Навуцы мы аддаём усе прыярытэты, без яе развіццё немагчымае. Але апошнім часам я бачу, што Акадэмія навук дапускала сур'ёзныя пралікі». Па словах Прэзідэнта, у такой сферы як навука, дзе прыходзіцца ісці непратаптанымі шляхамі, асвойваць сур'ёзныя праблемы, браць вяршыні, натуральна, памылкі магчымыя. Але, прызнаўся кіраўнік краіны, яго насцярожыла тое, што Акадэмія навук дапускала памылкі там, дзе іх быць не павінна, дзе ёсць добрая база ведаў і кампетэнцый. У прыклад Аляксандр Лукашэнка прывёў жывёлагадоўлю і раслінаводства. «Навукова-практычныя цэнтры створаны ў Акадэміі навук. Яны працуюць не лепш за іншыя адпаведныя цэнтры, якія працуюць па-за Акадэміяй навук, а павінны быць лепшымі», — заўважыў ён.

Па словах кіраўніка дзяржавы, звароты навукоўцаў, спецыялістаў і членаў урада пераконваюць у тым, што нам трэба сур'ёзна паглядзець на развіццё акадэмічнай навукі і прыняць адпаведныя рашэнні па ўсіх кірунках, у тым ліку і кадравых. «Я не хачу, каб прысутныя тут члены Акадэміі навук і навукоўцы падумалі, што мы тут рыхтуем нейкую акцыю супраць Акадэміі навук. Не. Нам трэба вельмі сур'ёзна падысці да вывучэння праблем Акадэміі навук і прыняць адпаведныя рашэнні. Бо без навукі далей нікуды», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

### ГЭТА СТРАТЭГІЧНА ПРАВІЛЬНЫ ПАДЫХОД

Прэзідэнт падкрэсліў, што мы жывём у эпоху беспрэцэдэнтных магчымасцяў развіцця нашай краіны. «Магчымасці каласальныя ўпусціць нельга. Ёсць устойлівая база і пэўныя вынікі як у традыцыйных галінах, так і ў новых кірунках эканомікі. Але без рэальнага прарыву ў навуцы падняцца на наступную прыступку будзе не проста складана — немагчыма. Навука павінна апярэджваць час, а не плесціся ў хвасце», — заявіў ён. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што з першых дзён прэзідэнцтва ён ставіў працу навукоўцаў у аснову ўсіх пераўтварэнняў жыцця.

«Развіццё айчыннай навукі — найважнейшы прыярытэт дзяржаўнай палітыкі. У свой час мы не далі знішчыць навуковыя школы і шматгадовыя напрацоўкі. Зрабілі ўсё магчымае для іх захавання. Мы зрабілі ўсё, як хацелі нашы вучоныя, акадэмікі, члены-карэспандэнты, дактары і кандыдаты навук, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Мяркую, надышоў час спытаць навукоўцаў за пэўны вынік. З якімі фундаментальнымі, стратэгічнымі распрацоўкамі мы ўвойдзем у новыя сярэдне- і доўгатэрміновую праграмы развіцця рэспублікі? Ці гатовы забяспечыць свой тэхналагічны суверэнітэт у цяперашніх рэаліях?»

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што размова не толькі і не столькі аб санкцыях. Па яго словах, мы да гэтага ўжо прывыклі, тым больш, яны пройдуць. «Размова пра шалёнае развіццё свету. Асабліва Азіі. Але і Захад не спіць у шапку. На апошнім саміце НАТА заяўлены чацвёрты прыярытэт (аж да стварэння цэнтральных органаў на ўзроўні Альянсу) — «тэхналагічны рывок». А гэта — квантавыя тэхналогіі, штучны інтэлект, біялогія і лічбавая трансфармацыя. Мы не павінны і проста не маем права адстаць», — сказаў ён.

СТАР. 2

Жніво-2024

# «ВАЖНА ПРОСТА ЛЮБІЦЬ САВЮ СПРАВУ»

## У чым сакрэт поспеху першых трохтысячнікаў Міншчыны

**У Дзяржынскім раёне Мінскай вобласці першыя камбайнеры-трохтысячнікі прынялі віншаванні. Механізатары Васіль ЗУР і Сяргей МАКСІМЕЦ з сельскагаспадарчага прадпрыемства «Крутагор'е-Петкавічы» ўжо ставілі нацыянальны рэкорд. У 2022 годзе яны першыя ў гісторыі краіны намалацілі шэсць тысяч тон збожжа на беларускім камбайне.**

СТАР. 3



Год якасці

# Павысіць узровень гасціннасці

## Як зрабіць унутраны турызм больш прывабным?

**Інфраструктура гасціннасці ў Беларусі развіваецца і ўдасканальваецца з кожным годам. Наша краіна можа як прымаць індывідуальных турыстаў, так і размяшчаць удзельнікаў значных мерапрыемстваў і падзей — міжнародных спартыўных спаборніцтваў, вялікіх канцэртаў, фестываляў, культурных форумаў. Што робіцца для павышэння якасці турпаслуг? Што павінен ведаць турыст, каб атрымаць турыстычную паслугу належнай якасці? І што рабіць, калі падчас падарожжа ўсё пайшло не так, як было заяўлена? Як атрымаць у такім выпадку кампенсацыю? Як прысвойваюцца зоркі гасцініцам і што павінна быць у пяцізоркавым атэлі? На што звярнуць увагу, расказалі спецыялісты.**



Фота з адкрытых крыніц.

СТАР. 5

ISSN 1990 — 763X
24147